Минский городской исполнительный комитет
Главное управление юстиции
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 190267001
07.02.2022 (дата) (подпись) О.В.Воробей

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
29.12 2021г. № 247

# СТАТУТ

**Установы**
**“ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА”**
**(новая рэдакцыя)**

# УСТАВ

**Учреждения**
**“ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИТЕРАТУРНО-МЕМОРИАЛЬНЫЙ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА”**
**(новая редакция)**

**г. Минск**
**2021**

# ЗМЕСТ

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ………………………………………………… 3
ГЛАВА 2. АСНОЎНЫЯ МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І ПРАДМЕТ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯ ………………………………………………………… 4
ГЛАВА 3. МАЁМАСЦЬ МУЗЕЯ ………………………………………………… 6
ГЛАВА 4. КІРАЎНІЦТВА МУЗЕЕМ …………………………………………… 7
ГЛАВА 5. ПРАЦОЎНЫ КАЛЕКТЫЎ МУЗЕЯ ……………………………… 8

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сатут установы "ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА" (далей – статут), з'яўляецца новай рэдакцыяй статута зарэгістраванага рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 23 жніўня 2017 г. у адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 190267001.

2. Установа "ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА" (далей – Музей) створана пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР "Аб увекавечанні памяцi народнага паэта БССР Якуба Коласа (Міцкевіча Канстанціна Міхайлавіча)" у 1956 годзе як Літаратурны музей Якуба Коласа, перайменавана ў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ў 1995 г. (загад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 1995 г. № 473). Заснавальнікам музея з'яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (далей – Заснавальнік).

3. Поўнае найменне Музея:

на беларускай мове - Установа "ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА";

на рускай мове - Учреждение "ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИТЕРАТУРНО-МЕМОРИАЛЬНЫЙ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА".

Скарочанае найменне Музея:

на беларускай мове - ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА;

на рускай мове - ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИТЕРАТУРНО-МЕМОРИАЛЬНЫЙ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА.

4. Музей з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае адасобленную маёмасць на праве аператыўнага кіравання, мае самастойны баланс, можа ад свайго імя набываць і здзяйсняць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы і несці абавязкі, выступаць у якасці істца і адказчыка ў судах, адкрываць разліковы і іншыя рахункі ў банках у адпаведнасці з заканадаўствам, мае пячатку са сваім найменнем і выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, неабходныя штампы.

5. Музей дзейнічае на падставе рашэнняў Заснавальніка, сапраўднага статута і заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

6. Маёмасць Музея з'яўляецца ўласнасцю Рэспублікі Беларусь. Маёмасць належыць Музею на праве аператыўнага кіравання.

7. У склад Музея ўваходзіць філіял “Мікалаеўшчына” з мемарыяльнымі сядзібамі “Акінчыцы”, “Альбуць”, “Смольня”, “Ласток” (Рэспубліка Беларусь, Мінская вобласць, Стаўбцоўскі раён, горад Стоўбцы, вуліца Сянкевіча, дом 6-2).

8. Музей адказвае па сваіх абавязацельствах грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць па яго абавязацельствах нясе ўласнік маёмасці Музея.

9. Музей можа выступаць у якасці ўдзельніка гаспадарчага таварыства або ўкладальнікам у камандзітным таварыстве з дазволу Заснавальніка, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

10. Месцазнаходжанне Музея:

Рэспубліка Беларусь, 220012, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.

11. Змяненні і дапаўненні ў статут уносяцца ў выпадках і тэрміны, якія ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

12. Рэарганізацыя або ліквідацыя Музея ажыццяўляецца ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

## ГЛАВА 2
## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І ПРАДМЕТ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯ

13. Асноўнымі мэтамі дзейнасці Музея з’яўляюцца выяўленне, захаванне, вывучэнне і папулярызацыя на навуковай аснове літаратурнай спадчыны народнага паэта Беларусі Якуба Коласа і выдатных дзеячаў нацыянальнай і сусветнай культуры, матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей, выкарыстанне іх для інтэлектуальнага і культурнага развіцця грамадства.

14. Галоўныя задачы Музея:

выяўленне прадметаў музейнага значэння;

камплектаванне музейных фондаў;

улік і захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў;

вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыя музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, у тым ліку шляхам правядзення на іх аснове навуковых даследаванняў архіўных, бібліятэчных і іншых крыніц, публічнага паказу музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, а таксама публікацыі адпаведных матэрыялаў;

кансервацыя і рэстаўрацыя музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў;

каталагізацыя музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў;

стварэнне і адкрыццё экспазіцый;

экскурсійнае абслугоўванне наведвальнікаў Музея;

ажыццяўленне культурна-асветніцкай работы і культурна-адукацыйнай дзейнасці, звязанай з музейнымі прадметамі, навукова-дапаможнымі і сыравіннымі матэрыяламі, а таксама нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі адпаведна профілю Музея;

вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыя нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей адпаведна профілю Музея;

правядзенне навукова-практычных семінараў і канферэнцый, іншых мерапрыемстваў па музейнай справе.

15. Прадметам дзейнасці Музея ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2011 “Виды экономической деятельности”, зацверджаным пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 5 снежня 2011 г. № 85, з’яўляюцца наступныя віды эканамічнай дзейнасці:

дзейнасць музеяў (код 91020);

здача ў наём уласнай і арандаванай нерухомай маёмасці (код 68200);

рознічны гандаль іншымі таварамі ў палатках, кіёсках і на рынках (код 47890);

выданне кніг (код 58110);

выданне часопісаў і перыядычных публікацый (код 58140);

іншыя віды выдавецкай дзейнасці, не ўключаныя ў іншыя групоўкі (код 58199);

арэнда і лізінг офісных машын і абсталявання, уключаючы вылічальную тэхніку (код 77330);

навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне грамадскіх і гуманітарных навук (код 72200);

тыражаванне запісаных носьбітаў інфармацыі (код 18200);

дзейнасць у галіне фатаграфіі (код 74200);

экскурсійнае абслугоўванне (код 79902);

дзейнасць у галіне выяўленчых мастацтваў (код 90010);

дзейнасць гістарычных месцаў і будынкаў і аналагічных турыстычных славутасцяў (код 91030).

16. У адпаведнасці з пералікам відаў дзейнасці, на ажыццяўленне якіх патрабуецца спецыяльны дазвол (ліцэнзія), і ўпаўнаважаных на яго выдачу дзяржаўных органаў і дзяржаўных арганізацый, згодна з дадаткам 1 да

Палажэння аб ліцэнзіраванні асобных відаў дзейнасці, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 г. № 450, Музей ажыццяўляе наступныя віды дзейнасці:

дзейнасць, звязаная з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі.

Іншыя віды дзейнасці, якія належаць ліцэнзаванню, ажыццяўляюцца пасля атрымання ліцэнзіі.

17. Музей можа ажыццяўляць іншыя віды дзейнасці, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18. Музей здзяйсняе знешнеэканамічную дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## МАЁМАСЦЬ МУЗЕЯ

19. Маёмасць Музея складаюць асноўны фонд і абаротныя сродкі, а таксама іншыя каштоўнасці.

20. Музей фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Дадатковае фінансаванне музея можа ажыццяўляцца за кошт грашовых сродкаў, атрыманых у выглядзе бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, дзейнасці, якая прыносіць даход і неабходна для выканання мэт, прадугледжаных дадзеным статутам, адпавядае гэтым мэтам і прадмету дзейнасці некамерцыйнай арганізацыі, і з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

21. Музей мае права ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даход. Атрыманыя ад такой дзейнасці даходы і набытая за іх кошт маёмасць паступаюць у самастойнае распараджэнне Музея і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

22. Музей вядзе бухгалтарскі ўлік і ўлік статыстычных дадзеных у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Згодна з заканадаўствам падае дадзеныя ў падатковыя органы і нясе адказнасць за іх дакладнасць.

Музей з даходаў плаціць падаткі ў бюджэт і карыстаецца ільготамі ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

23. Музей у дачыненні да замацаванай за ім маёмасці ажыццяўляе ў межах, вызначаных заканадаўствам, у адпаведнасці з мэтамі сваёй дзейнасці, заданнямі Заснавальніка і прызначэннем маёмасці правы валодання, карыстання і распараджэння ёю.

24. Музей не мае права без згоды Заснавальніка адчужаць або іншым спосабам распараджацца, замацаванай за ім маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, выдзеленых яму па каштарысу, калі іншае не ўстаноўлена Грамадзянскім Кодэксам Рэспублікі Беларусь або іншым заканадаўчым актам, акрамя маемасці замацаванай за арганізацыяй на праве гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання, калі налічаная на яго амартызацыя складае 100 працэнтаў або скончыўся нарматыўны тэрмін службы.

Заснавальнік маёмасці, замацаванай за Музеем, мае права зрабіць адабранне лішняй маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ці выкарыстоўваецца не па прызначэнні, і распарадзіцца ёю па сваім меркаванні.

25. Здача Музеем у арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў яго аператыўным кіраванні, або перадача ўказанай маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне дапускаецца толькі са згоды Заснавальніка.

26. Музей не мае права быць гарантам, паручыцелем трэціх асоб – юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці (у тым ліку долі (акцыі) у статутных фондах, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці) і фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў) па выкананні гэтымі асобамі сваіх абавязацельстваў па вяртанні крэдытаў, прадастаўленых банкамі і небанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі, за выключэнне крэдытаў, якія выдаюцца на будаўніцтва жылых памяшканняў, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4
## КІРАЎНІЦТВА МУЗЕЕМ

27. Кіраўніком Музея з'яўляецца дырэктар. Дырэктар назначаецца на пасаду і вызваляецца з пасады Заснавальнікам і дзейнічае на падставе заключанага з ім кантракта.

28. Дырэктар Музея:

забяспечвае выкананне планаў дзейнасці Музея;

нясе адказнасць за арганізацыю выканальніцкай работы, адпаведны ўзровень музейнай і навукова-даследчай дзейнасці Музея;

ажыццяўляе пастаянны кантроль за якасцю правадзімых мерапрыемстваў, дзейнасцю вучонага савета, фондава-закупачнай і іншых камісій Музея, устанаўлівае кампетэнцыю і парадак іх дзейнасці;

наймае і звальняе работнікаў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку назначае на пасады і вызваляе ад пасад па ўзгадненні з

Міністэрствам культуры намеснікаў дырэктара, галоўнага бухгалтара і кіраўніка кадравай службы;

без даверанасці дзейнічае ад імя Музея, прадстаўляе яго інтарэсы ў адносінах з дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі і фізічнымі асобамі;

у межах, устаноўленых заканадаўствам і сапраўдным статутам, распараджаецца маёмасцю, у тым ліку сродкамі Музея;

заключае дагаворы ад імя Музея;

адкрывае ў банках разліковы, валютны і іншыя рахункі;

у адпаведнасці з Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку прымае меры па заахвочванні і дысцыплінарным спагнанні работнікаў Музея;

выдае даверанасці;

выдае загады і дае ўказанні, абавязковыя для ўсіх работнікаў Музея;

вызначае ва ўстаноўленым парадку ўмовы аплаты працы работнікаў Музея;

зацвярджае штатны расклад;

рэгулярна (не радзей за адзін раз у год) трымае справаздачу перад Заснавальнікам, а таксама прадастаўляе дакументы і інфармацыю, якія тычацца дзейнасці Музея;

устанаўлівае рэжым камерцыйнай тайны;

выконвае іншыя функцыі, прадугледжаныя заканадаўствам і кантрактам.

29. Дырэктар Музея нясе адказнасць за вынікі работы Музея, выкананне патрабаванняў сапраўднага статута, абавязацельстваў перад Заснавальнікам і працоўным калектывам. Адказнасць дырэктара перад Заснавальнікам вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам і кантрактам.

## ГЛАВА 5
## ПРАЦОЎНЫ КАЛЕКТЫЎ МУЗЕЯ

30. Працоўныя адносіны з работнікамі Музея, уключаючы пытанні найму і звальнення, рэжыму працы і адпачынку, умоў аплаты працы, гарантый і кампенсацый, рэгулююцца ў працоўных дагаварах (кантрактах), лакальных нарматыўных прававых актах у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

31. Працоўны калектыў Музея:

вырашае пытанні заключэння з адміністрацыяй калектыўнага дагавору, разглядае яго праект і ўпаўнаважвае прафсаюзны орган падпісаць яго ад імя працоўнага калектыву;

вырашае іншыя пытанні самакіравання Музея ў межах сваёй кампетэнцыі, устаноўленай заканадаўствам і дадзеным статутам.

32. Асноўнай формай здзяйснення працоўным калектывам Музея сваіх паўнамоцтваў з’яўляецца агульны сход.

33. Агульны сход працоўнага калектыву Музея склікаецца па меры неабходнасці.

34. Агульны сход працоўнага калектыву Музея лічыцца паўнамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за 2/3 работнікаў Музея.

35. Агульны сход працоўнага калектыву Музея вырашае аднесеныя да яго кампетэнцыі пытанні простай большасцю галасоў прысутных на сходзе работнікаў.

36. Для кіравання сваёй работай агульны сход выбірае старшыню. Для вядзення пратакола і ажыццяўлення іншых тэхнічных функцый, агульны сход выбірае сакратара.

У сапраўдным Статуце пранумеравана,
прашнуравана и замацавана пячаткай
Установы «Дзяржаўны літаратурна-
мемарыяльны музей Якуба Коласа»
9 (дзевяць) лістоў